**Блажэвіч, Э.** На перадавой : [з артыкула] / Э. Блажэвіч // Сцяг працы (Міёры). — 1988. — 9 лют. — С. 3.

## НА ПЕРАДАВОЙ

І тут тут прыпомніліся Анатолю доўгія калоны машын у гарах Афганістана. Упэўнена кіраваў ён магутным УРАЛам. У вышыні – распаленае сонца. Па твары цякуць ручайкі поту. Ззаду і спераду за рулём машын гэткія ж, як і ён, маладыя салдаты, яго сябры. А сярод скал – душманы. У кабіне не чутна свісту куль, але на душы трывожна. Мацней сціскаюць рукі баранку. І такое пачуццё таварыскасці раптам агортвае цябе. Упэўнены, здарыцца з кім-небудзь бяда, сябры прыйдуць на дапамогу. Адслужыў свой тэрмін Анатоль Варона паспяхова. Толькі ў кабіне яго машыны засталіся, нібы высвідраваныя свеердзялком, дзве маленькія дзірачкі ад куль. Ехаў дадому хлопец узмужнелы, загартаваны і марыў вось так, як цяпер, старанна працаваць на роднай мірнай зямлі, дзе кожны дзень прыносіць радасць. задавальненне.

**Э. Блажэвіч**